# БЕДЫ З АБЕДАМ

—ЯКАЯ ўсё ж была скарга? — не вытрымала, запыталася-такі пад канец загадчыца вытворчасці філіяла сталовай № 33 на хімфаку Ларыса Міхайлаўна Кацяк.

І мы зразумелі, чаму з такім недаверам, нават падазронасцю аднесліся да правяраючых усе: пачынаючы з повара і заканчваючы прыбіральшчыцай, чаму так настойліва імкнуліся прадугледзець кожны крок камісіі і «своечасова» выправіць недахопы ў тым ці іншым падсобным памяшканні, каб потым запэўніць скорагаворкай: «Заўсёды ў нас чысціня і парадак, гэта толькі сёння...»

Знайсці тлумачэннё было не цяжка: у гэты дзень да сустрэчы з намі тут не паспелі падрыхтавацца. А недзе ў глыбіні душы, ацэньваючы дастаткова аб'ектыўна, без перабольшання, якасць сваёй працы, пабойваліся: без скаргі (і, магчыма, не адной) не абышлося. Так лічылі работнікі сталовай, наракаючы на чарговага скаржніка.

Са скаргамі наведвальнікаў і прысутнасцю правяраючых тут звыкліся да такой ступені, што не спяшаюцца рэагаваць на заўвагі, а ў адказ прыводзяць пераканаўчую, на іх погляд, адгаворку: «На густ, як вядома... Словам, кожнаму не дагодзіш». На гэты раз яна не дапамагла, бо камісія па праверцы гатоўнасці пунктаў грамадскага харчавання да новага навучальнага года, створаная камітэтам народнага кантролю і штабам «Камсамольскага пражэктара» універсітэта, не ставіла мэтай пацвердзіць або абвергнуць нечае абвінавачанне. Яна хацела, не шукаючы пасрэднікаў, убачыць усё ўласнымі вачыма.

З лёгкай рукі медыкаў гастрыт і язву страўніка пачалі называць прафесійнымі хваробамі студэнтаў. Лекцыі, бібліятэка, лабараторныя заняткі, партыйныя секцыі, грамадскія даручэнні... Не тое што паабедаць — булачку перахапіць няма часу. «Вірус хваробы — у адсутнасці вольнага часу». Забыўся, не купіў, паленаваўся прыгатаваць... Вось і кажыце «дзякуй» зняважлівым адносінам да ўласнага здароўя. Пачакайце! А ці спрабаваў хто-небудзь даследаваць, чым і як кормяць студэнтаў у сталовай?

## Акуратнасць у крэдыт

ВЯЛІКАЙ чаргі тут не бывае. Ваганняў наконт выбару той ці іншай стравы не заўважаецца.

Словы «прыемнага апетыту!» гучаць як кпіны.

Жадання зайсці сюды яшчэ раз не ўзнікае, таму што смачнай ежы тут таксама ніколі не прапаноўваюць (акрамя нядрэнных салатаў), асартыментны мінімум абнаўляецца толькі ў выключных выпадках (калі ж з'явіцца ў меню нешта накшталт «кураня з бульбай», дык цана наогул не па студэнцкай кішэні, і яшчэ паспрабуйце адшукаць у талерцы хоць рэшткі таго кураняці), а прыемны апетыт знікае пры першым поглядзе на брудныя відэльцы і лыжкі, на мутныя шклянкі і даўно ўжо не ззяючыя чысцінёй сталы. Ці патрэбна тады здзіўляцца, што студэнты і супрацоўнікі аддаюць перавагу іншым сталовым, не заглядваючы ў тую, што знаходзіцца побач, на хімічным факультэце?

Аб набліжэнні да сталовай паведаміў своеасаблівы пах. Існуе ён з тае самае пары (так сцвярджаюць старажылы), калі адбылося адкрыццё сталовай. Захаванне сапсаваных прадуктаў доўгі час прымаецца тут за правіла. І апраўданне знаходзіцца адразу: няма камеры для харчовых адходаў.

Прызвычаіліся не звяртаць увагі і на шмат іншых з'яў. Толькі члены камісіі, асобы пабочныя, адважыліся адзначыць, што сыр і рыба, кавуны і мяса захоўваюцца чамусьці разам, што камера для халодных закусак ператварылася ў склад масла і малака. Яны ж прыдзірліва аглядалі кожны закутак і задавалі, па меркаванню работнікаў сталовай, зусім ужо недарэчныя пытанні: «Што робіць на ўмывальніку блюда з салатай?», «Для якой патрэбы захоўваецца ўспухлая банка з селядцамі?»

А потым зазірнулі ў пасудамыйку і не прамінулі скрыню са скарынкамі цвілога хлеба.

— Ну, гэта ж зусім трошкі,— спрабавала запэўніць нас Л. М. Кацяк.

Атрымлівалася: не вер вачам сваім, а слухай загадчыцу вытворчасці і пераканаешся, што пяць цвілых буханак — гэта і не хлеб нават.

Але часам не ўсё залежыць ад работнікаў сталовай: захаваць хлеб на доўгі час няма магчымасці, а менш як пяць латкоў, па невядома кім заведзенаму правілу, пастаўшчыкі завозіць адмаўляюцца.

Затое да сродкаў, якімі мыюць посуд, тут, як і ў іншых сталовых універсітэта, адносіны асобыя: іх проста няма. І куды ні звярталіся: да дырэктара базавай сталовай № 33, да санітарнага ўрача — ніхто не дапамог.

— Уваходзіць у ваша становішча мы не можам,— гавораць прадстаўнікі санітарна-эпідэміялагічнай станцыі і запісваюць чарговую заўвагу. Іх колькасць у санітарным журнале ўзрастае ад праверкі да праверкі, а наведвальнікам сталовай па-ранейшаму даводзіцца карыстацца брудным посудам. Яны ў становішча персанала ўвайсці, аказваецца, павінны. Толькі ці надоўга хопіць іх цярплівасці?

Дарэчы, вы ніколі не задумваліся, чаму ўсё радзей і радзей наведваеце сталовую на сваім факультэце? Мне здаецца таму, што іменна там вас адвучылі па-сапраўднаму адчуваць смак абеду.

...Спатрэбілася ўсяго толькі пятнаццаць хвілін, каб заблішчэла чысцінёй падлога ў падсобных памяшканнях і цэхах сталовай хімфака. Адбылося гэта амаль у канцы рабочага дня (а інструкцыя, ды і элементарнае пачуццё акуратнасці патрабуюць трохразовай уборкі) пасля заўвагі камісіі. Хто ведае, можа, калі б не яна, то і не адважылася б прыбіральшчыца ўзяць у рукі шчотку і анучу. Дарэчы, пра гэту самую шчотку можна было б расказаць доўгую гісторыю. Спачатку яе не было (старая знасілася ці некуды знікла), потым паявіўся запіс у таўсценным журнале, з ім азнаёміўся дырэктар сталовай, аб чым сведчыць асабісты подпіс тав. Ю. М. Свірыдчыка. Толькі ўсё роўна заставалася б падлога не мытай, калі б не Фёдараўна, якая, па словах загадчыцы вытворчасці, прынесла, нарэшце, шчотку з дому. Калі такія цяжкасці з дробязямі, то што тады казаць аб праблемах накшталт сапсаванага халадзільніка ці няхваткі мыечных апаратаў?

У час рэйду я звярнулася да адной студэнткі ў зале:

— Акуратнасць у крэдыт — гэта калі...

—...Я прыходжу ў сталовую і наіўна спадзяюся, што гэты раз відэлец будзе чысты. Калі пасля абеду мне застаецца толькі марыць аб тым, што хоць на адным стале знойдуцца сурвэткі.

А яе сяброўка сумна пажартавала:

— Калі сваёй акуратнасці не маюць, пазычылі б у каго-небудзь.

Я нават магу падказаць жадаючым канкрэтны адрас: буфет інтэрната № 3, дзе працуе Лідзія Мікіцічна Дзмітрыева.

## Мінус повар плюс пасудамыйка

СТАЛОВАЯ інтэрната № 7 сустрэла доўгай гаманлівай чаргой. Пасля таго, як закрылі на рамонт сталовую № 33, усе наведвальнікі перайшлі сюды, і чарга зрабілася неабходным атрыбутам. У ёй стаяць не толькі студэнты і супрацоўнікі універсітэта. Нярэдка заглядваюць сюды і будаўнікі метро. Справа не ў тым, што павялічваецца колькасць наведвальнікаў (сталовая разлічана на абслугоўванне па дзвюх лініях, і патрэбна спытаць у адміністрацыі, чаму ў час «пік» працуе толькі адна?), а ў іх неахайным выглядзе. Ужо колькі разоў гаварылася аб забароне абслугоўвання людзей у спецадзенні, толькі многія работнікі сталовай яшчэ чамусьці не пачулі гэтага.

Гуляш з ялавічыны, рулет ялавічны з яйцом, запяканка... Пяць назваў страў, запісаных у меню, адсутнічалі ў час абеду на раздачы.

— Не паспелі,— апраўдваецца загадчыца вытворчасці Ніна Аляксандраўна Ільіна.

Яе можна зразумець. Іменна ў гэты дзень захварэлі два повары, і сама яна вымушана была выйсці на раздачу.

— Не хапае дзвюх пасудамыек, кухонных рабочых,— працягвае пералік Ніна Аляксандраўна і знаёміць нас з кваліфікаваным поварам, якая займаецца... мыццём катлоў. І гэта ў той час, калі яе вопыт і майстэрства так неабходны ля пліты.

— Няма падсобных рабочых,— скардзяцца і ў сталовай галоўнага корпуса, а на хімфаку прыводзяць такія лічбы: замест чатырох пасудамыек працуе адна (уявіце сабе якасць яе работы), ніхто не згодны ісці працаваць прыбіральшчыцай (ці пад сілу адной пажылой жанчыне выконваць гэтыя абавязкі?).

І яшчэ адзін факт для роздуму. У студэнцкіх сталовых працуюць у асноўным повары III і IV разрадаў.

— А хто ж будзе пасылаць сюды высокакваліфікаваныя кадры? — абурыліся на хімфаку.

Іх заўвагу мы прынялі да ведама. Толькі незразумела, чаму павінны пакутаваць студэнты?

— Два гады назад гатавалі намнога смачней,— выказалі думку студэнты філфака, што абедалі ў сталовай інтэрната № 7.— Дарэчы, пра цану. За тыя ж восемдзесят ці дзевяноста капеек у іншым месцы можна добра паесці.

Можа таму і не адрозніваюцца стравы, прыгатаваныя поварамі, ні смакам, ні знешнім выглядам, ні разнастайнасцю, што лічаць яны непатрэбным па-сапраўднаму клапаціцца аб звычайных студэнтах. І калі б толькі яны прытрымліваліся такой думкі!

Кожная гаспадыня разумее, як цяжка нават пры жаданні і неблагім уменні прыгатаваць страву з абы-якога прадукта. На што ж можна разлічваць, маючы ў гаспадарцы толькі катлетную ялавічыну або свініну? Зразумела, на самыя звычайныя і непрывабныя стравы, з якімі план выканаць немагчыма. Паўстае пытанне аб своечасовым забеспячэнні студэнцкіх сталовых дабраякаснымі прадуктамі. І вырашаць яго патрэбна не толькі самім работнікам (яны ж часам не спрачаючыся прымаюць усё, што ім даюць), а і арганізацыям па забеспячэнню, якія выступаюць пакуль у якасці капрызных гаспадароў сітуацыі.



## І дзверы на замку

ЗНАХОДЗІЦЦА ён якраз там, дзе больш за ўсё і патрэбен пункт грамадскага харчавання — у студэнцкім гарадку. З сакавіка 1986 года дзверы яго зачынены. У памяшканні ідзе рамонт. Праўда, амаль год жадаючыя пацікавіцца, на якой стадыі ён знаходзіцца, вымушаны расчаравана адыходзіць, убачыўшы велізарных памераў замок. Вядома адно: ні грукату, ні гоману галасоў, ні наогул прыкмет жыцця чуваць не было. І зараз яго адкрыццё адкладваецца кожны месяц. Спадзяваліся студэнты атрымаць падарунак да новага навучальнага года. Не атрымалі. Першага кастрычніка іх таксама чакала расчараванне. «Можа ў лістападзе?» — асцярожна выказваюцца самыя аптымістычныя. Толькі верыцца насілу, бо ў сярэдзіне кастрычніка за ўстаноўку абсталявання ніхто яшчэ не браўся. Дзверы зачынены, а праз вокны штосьці не праглядаецца перспектыва хуткага адкрыцця. Колькі ж можна чакаць?

Пакуль пакутуюць больш за ўсіх студэнты падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян. Праўда, пры дапамозе настойлівых намаганняў выкладчыкаў у інтэрнаце адкрыўся невялічкі буфет. Паявілася магчымасць купіць булачку, выпіць шклянку соку ці малака. Але ні аб якіх гарачых стравах ці напітках не можа быць і гаворкі. Ды і работу буфетчыцы пракантраляваць немагчыма: працуе яна па вольнаму графіку.

Чакаюць не дачакаюцца адкрыцця сталовай № 33 і работнікі кандытарскага цэха, якія пакуль здымаюць на правах кватарантаў невялічкі закутак паміж цэхамі сталовай № 7, карыстаюцца яе жарачнай шафай і складзіруюць гатовую прадукцыю тут жа, на калідоры. Працуючы ў такіх умовах, паспяваюць прыгатаваць кандытарскія вырабы толькі пасля абеду, калі большасць студэнтаў, так і не паспытаўшы булачак, ідуць дамоў.

Атрымліваецца, што універсітэту ні холадна, ні горача ад існавання ўласнага кандытарскага цэха, таму што на другі дзень булачкі ўжо выглядаюць не лепшым чынам. А іх асартымент не вылучаецца разнастайнасцю.

## «А дзе мне ўзяць?..»

**Сумны маналог дырэктара сталовай № 33 Ю. М. Свірыдчыка.**

ВЫ ЛІЧЫЦЕ, што быць дырэктарам сталовай вельмі лёгка? Памыляецеся. Не ведаю нават, з чым параўнаць гэтую пасаду. Прыходжу ў свой рабочы кабінет і гадзінамі тэлефаную, дабіваюся, каб завезлі цукар у адну сталовую, забралі булачкі з кандытарскага цэха, адрамантавалі халадзільнік на хімфаку... Да сённяшняга дня турбуюся, дзе мне ўзяць спецыялістаў-повараў, знайсці буфетчыц, пасудамыек і прыбіральшчыц. Спрабую разабрацца з пытаннямі рамонту старога аснашчэння. Гэта не проста, хоць і існуе дагавор паміж універсітэтам і Белгандальтэхнікай па абслугоўванню машын і апаратаў. Але часцей за ўсё здараецца, што не хапае то запасных дэталей, то рабочых рук.

З надзеяй паглядаю на будаўнікоў і рамонтнікаў, што працуюць (а лепш за ўсё сказаць бяздзейнічаюць) у памяшканні сталовай № 33. Першага снежня мы атрымаем план выпуску прадукцыі і на гэтую сталовую. Калі дзверы будуць па-ранейшаму зачынены, давядзецца «раскідаць» яго на астатнія пункты харчавання.

Амаль бяздзейнічае кандытарскі цэх, а мы ж маем спецыялістаў, здольных выпякаць нават тарты, былі б не супраць арганізаваць у сталовых, буфетах, барах выстаўкі-продажы кандытарскіх вырабаў. Але ж у цяперашніх умовах, самі разумееце, дазволу санэпідстанцыі нам не дачакацца. З гэтай установай у нас даўно адносіны не з лепшых

Не хапае ў сталовых сродкаў для мыцця посуду. Трынітрафасфат нам не выдзяляюць, «Жэмчугам» замяняць яго нельга. Застаецца толькі сода, а паспрабуйце знайсці яе! Праблему вырашаем такім чынам: заключаем неафіцыйны, заснаваны на асабістых сувязях дагавор з камендантамі інтэрнатаў і ў поўнай ступені залежым ад іх настрою. Пажадае камендант — будуць чыстымі талеркі і міскі, адмовіць...

Існуюць цяжкасці з падвозам прадуктаў у буфеты. У мінулым годзе кожны дзень давалі нам машыну на адну гадзіну. Сёння гэтага недастаткова.

Але ўсё ж такі самае балючае пытанне — цякучасць кадраў. Былі б сталовыя ўкамплектаваны кадрамі — і пры любых умовах можна было б працаваць.

P.S. ДА МАНАЛОГА. (**Пункт гледжання наведвальніка сталовай). І тым не менш вялікая частка (а па падліках студэнтаў хімічнага факультэта 50—60 працэнтаў) работнікаў кожны дзень пакідае свае непасрэдныя рабочыя месцы і ператвараецца ў гандляроў фаршам на вуліцах горада. Сакрэт у тым, што толькі 50 працэнтаў плана выконваюць работнікі за кошт студэнтаў. А як назваць астатняе? І ці не лепш па-сапраўднаму паклапаціцца аб якасці сваёй работы, чым такім чынам шукаць выйсце з лабірынтаў планавых заданняў?**

**ЯК БАЧЫЦЕ, праблем тут шмат. І гэта пры так званай павярхоўнай праверцы, калі амаль не праглядаліся дакументы, не звярталася належнай увагі на якасць прыгатаваных страў.**

**Не адна інстанцыя кантралюе дзейнасць пунктаў грамадскага харчавання: гандлёвая і санітарная інспекцыі, народны кантроль. А дзейсных вынікаў яшчэ чакаць ды чакаць. У маі гэтага года камісіяй, у састаў якой увайшлі прадстаўнікі прафкомаў студэнтаў і супрацоўнікаў, было праведзена апытанне грамадскай думкі. Вынікі? Ніхто з 1200 апытаных не даў цалкам станоўчага адказу.**

**Паляпшэнне матэрыяльнай базы універсітэта залежыць ад прадстаўнікоў адміністрацыйна-гаспадарчай часткі. Яны ж, напэўна, павінны паклапаціцца аб прывядзенні фінансавага плана сталовых у адпаведнасць з іх тэхналагічнымі магчымасцямі.**

**І яшчэ адно пытанне хвалюе сёння многіх. Ва універсітэце няма ніводнага дыетычнага пункта грамадскага харчавання. А мець такі было б нядрэнна.**

**Такім чынам, пытанне «Чым і як будзе харчавацца студэнт?» паўстае з новай сілай.**

Матэрыялы да друку падрыхтавала
М. ЗАГОРСКАЯ,
наш кар.

# Данясі сваю любоў!

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.).

Да таго ж абяцаюць у хуткім часе ўсё ўладкаваць.

Зараз галоўнае для цябе — хутчэй пасябраваць з «мясцовымі». Цяжка. Спачатку ты лічыш, што перашкаджае моўны бар'ер, але... твае таварышы па пакою — чаму яны так скоса паглядаюць на цябе?

Ты паціху асвойваешся, знаёмішся з горадам. Аднойчы ў магазіне ты не змог растлумачыць прадаўцу, што табе трэба. І са здзіўленнем даведаўся, што за гэта на цябе могуць моцна накрычаць і нават затупаць нагамі. У цябе сапсаваны настрой, ты вырашаеш пайсці да сваіх землякоў у другі інтэрнат. І ледзь не самлеў, убачыўшы так званую «вахту», якая больш падобна на абароннае ўмацаванне напалеонаўскай арміі, ахоўваемае ўсялякімі аператрадамі, студсаветамі, камендантамі, вахцёрамі, дзяжурнымі. Яны чамусьці ўсе шукаюць прычыну, каб зрабіць табе ад варот паварот. Карацей, з ушчэнт сапсаваным настроем ты вяртаешся дадому. А думкі твае з усё большай настойлівасцю «круцяцца» вакол сапраўднага дома. Сумуеш. З нецярпеннем чакаеш пісьмаў. Урэшце атрымліваеш, але ў якім выглядзе! Паштовыя маркі садраны, канверт — пашматаны, а дзе фотакарткі з вяселля сястры? І няма каму паскардзіцца...

«Нічога»,— думаеш ты, спадзеючыся, што вучоба адцягне цябе ад тваіх маленькіх няўдач і перажыванняў. Але... лекцыі ў большасці сваёй сумныя, да таго ж шмат чаго ты ведаеш яшчэ са школы. А калі звяртаешся з пытаннямі да сакурснікаў, то яны або вельмі некампетэнтна адказваюць, або самі жадалі б пачуць адказ.

Хочацца тут зрабіць невялічкае адступленне і выказаць ужо даўно набалелае адносна эрудыцыі нашых студэнтаў.

Ствараецца ўражанне, што паступаюць у вышэйшую школу ў большасці сваёй людзі, якія маюць даволі цьмянае ўяўленне аб свеце, у якім жывуць. Іх нічога не цікавіць!!! Ад гэтага пытанні і выказванні прыкладна такія: «Дзе знаходзіцца Егіпет?», «У арабаў няма пісьменнасці?», «Асеція — гэта недзе каля Лівіі?», «У Грузіі носяць чадру і чаканяць сваю манету?», «О'Генры — гэта хто?», «Гамаль Абдэль Насэр — гэта накшталт Пінвчэта?» і г. д. Смешна? А на маю думку, жудасна. Трэба ж бачыць крыху далей свайго носа!

Звернемся да гульні. Ты вельмі заняты вучобай, але калі цябе просяць выступіць на якім-небудзь мітынгу-канцэрце, ты з ахвотай згаджаешся. Зрываешся з апошняй лекцыі, каб не спазніцца на рэпетыцыю... Праходзіць гадзіна, пакуль паявіцца арганізатар і папросіць прабачэння за тое, што пераблытаў час (а можа, і не папросіць). Праходзяць дзве гадзіны, пакуль урэшце збярэцца мізерная жменька артыстаў. А яшчэ праз час табе аб'яўляць, што канцэрт пойдзе без рэпетыцыі, амаль экспромтам. Канцэрт адбыўся, але як сумна было на ім і ўдзельнікам, і гледачам...

Шмат яшчэ пра што можна было гаварыць. Думаю, ты і сам здольны прыгадаць нямала ўсялякіх несамавітых выпадкаў, сведкам якіх табе давялося быць, а можа была і твая віна ў тым, што яны здарыліся з нашымі замежнымі сябрамі? І не трэба гучных выразаў пра інтэрнацыянальнае сяброўства і адносіны. Лепш ператвары іх у сапраўдныя ўважлівыя адносіны да тых, хто прыехаў за тысячы кіламетраў, нярэдка з рызыкай для свайго далейшага лёсу, вучыцца ў Краіну Саветаў! Ніякія словы не змогуць аказаць лепшага ўплыву на ўражанне аб нашай краіне, чым твае і мае будзённыя ўчынкі. Думаю, гэта і будзе лепшай контрпрапагандай.

Ты любіш сваю краіну? Дык што перашкаджае табе данесці гэтую любоў да нашых гасцей? Якім запомняць яны ТВОЙ ДОМ?

Цінацін МЖАВАНАДЗЕ,
студэнтка філалагічнага факультэта.

## КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ



АПРАНУЛІСЯ святочна. Сабраліся аднак не на танцулькі, хаця дыскатэка і мелася на ўвазе ў канцы. Сабраліся, каб прама гледзячы адзін аднаму ў вочы, выказаць тое, што хвалюе і турбуе, каб разам абмеркаваць тое, што перашкаджае жыць згуртавана, цікава і творча, сабраліся, каб яшчэ раз адчуць: мы — адзіны калектыў і клопаты ў нас агульныя. І жадалі таго ці не, а сабраліся, каб лепш пазнаць сваіх лідэраў і кіраўнікоў, а тыя, у сваю чаргу, пазнавалі іх — яршыстых і разважлівых, абыякавых і прынцыповых, іх — сваіх студэнтаў і таварышаў.

Ішла звычайная чарговая, X па ліку, справаздачна-выбарная канферэнцыя на механіка-матэматычным факультэце. Звычайная і не зусім. Быў на ёй, зразумела, і рэгламент часу для выступаючых, быў і звычайны сцэнарый правядзення. Але не было сухіх, фармальных выразаў, а была жывая і дэмакратычная размова, якая змагла выліцца за межы традыцыйнага падвядзення вынікаў работы камсамольскіх арганізацый факультэта. Гаварылі пра камсамол, моладзь, сучаснасць, пра сябе.

І нягледзячы на тое, што ацэнку рабоце факультэцкага камітэта камсамола аднадушна вынеслі — «здавальняюча», у крытычным падыходзе да сябе ёсць свая перавага — той, хто праўдзіва змог прызнаць свае недахопы, зможа іх і пераадолець.

Справаздачна-выбарныя канферэнцыі адбудуцца на ўсіх факультэтах да 10 лістапада.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

**Калі ў вас ёсць цікавасць, жаданне і ўсвядомленая неабходнасць атрымаць другую, грамадскую, прафесію, калі ласка, вас чакаюць на факультэце грамадскіх прафесій. Якое аддзяленне вам больш па душы?**

# Заву ў другую прафесію

АДДЗЯЛЕННЕ арганізатараў грамадска-палітычнай работы ўключае секцыі: школа маладога лектара і школа камсамольскага і прафсаюзнага актыву. Тут вывучаюцца актуальныя праблемы камуністычнага выхавання моладзі, міжнароднага маладзёжнага руху, ідэалагічнай барацьбы, унутрысаюзнай работы ВЛКСМ, арганізацыі грамадска-палітычнай практыкі і агітацыйна-прапагандысцкай работы. Сёлета заняткі плануецца праводзіць у вучэбна-тэлевізійным комплексе на хімічным факультэце.

Аддзяленне арганізатараў культурна-асветніцкай работы прапануе наступныя секцыі: тэатральнай рэжысуры, культуры мовы і харэаграфіі. На занятках па тэатральнай рэжысуры вы зможаце авалодаць асновамі рэжысёрскага і акцёрскага майстэрства, прайсці тэарэтычны курс агульнай гісторыі тэатра.

Кіраўнік секцыі культуры мовы А. В. Вторава навучыць вас правільна гаварыць, лагічна будаваць выраз, так, каб ён найбольш дакладна выказваў думку, правільна ставіць націск у словах і варазах і г.д. У далейшым вы зможаце выкарыстоўваць сваё ўменне на практыцы — у час вучобы, працы, у пазакласнай і грамадскай рабоце.

Ведучы заняткі ў секцыі харэаграфіі, кіраўнік М. В. Харламаў дапаможа вам авалодаць навыкамі пастаноўкі харэаграфічных кампазіцый, што дасць магчымасць у далейшым кіраваць самадзейнымі танцавальнымі калектывамі.

Аддзяленне арганізатараў работы з дзецьмі і падлеткамі рыхтуе піянерскіх важатых, кіраўнікоў школьных гурткоў. Выкарыстаць набытыя веды вы зможаце ў час педагагічнай практыкі ў піянерскіх лагерах і школах. На аддзяленні будуць таксама працаваць выкладчыкі кафедры педагогікі БДУ і кіраўнікі калектываў мастацкай самадзейнасці.

На факультэце працуе і аддзяленне арганізатараў ваенна-патрыятычнай і абаронна-масавай работы. Кіруе ім заслужаны работнік культуры БССР, падпалкоўнік А. С. Харэбін.

Асаблівай папулярнасцю карыстаецца аддзяленне турызму і аховы прыроды. Яно рыхтуе інструктараў-метадыстаў па турызму, арганізатараў турысцка-экскурсійнай работы. Слухачы аддзялення будуць хадзіць на экскурсіі і ў паходы па непаўторных мясцінах нашай Радзімы.

Тых, хто валодае пэндзлем, чакаюць на аддзяленні мастакоў-афарміцеляў і актывістаў насценнага друку. А кіраўнік секцыі стэнаграфіі У. Герасімаў прафесійна дапаможа вам авалодаць навыкамі хуткага пісьма. Сёлета аднаўляе работу і секцыя мастакоў-афарміцеляў, якая навучыць слухачоў працаваць з рознымі тыпамі шрыфтоў, пазнаёміць з асновамі фармальнай кампазіцыі.

Пры залічэнні ў секцыю фотакарэспандэнтаў неабходна толькі адно — мець уласны фотаапарат. Астатняму навучыць кіраўнік — загадчык фоталабараторыі ТСН БДУ В. В. Уласаў.

Набор на аддзяленні факультэта грамадскіх прафесій працягваецца. Каб запісацца сюды, патрэбна звярнуцца у камітэт камсамола свайго факультэта ці ў дэканат ФГП (вул. Бабруйская, 9, п. 61).

Э. АНІСЕНКА,
дэкан ФГП.

## БАЙЦЫ РЭВАЛЮЦЫІ

# Жыццё — подзвіг

У ЦЭНТРЫ Бабруйска — краязнаўчы музей. Знаёмімся з метрычнай кнігай за 1903 год. У ёй 14 верасня (па старому стылю) служыцелі культу засведчылі сваімі подпісамі факт нараджэння сто дзевяноста трэцяй жанчыны за год — Веры Захараўны Харужай. Яны, безумоўна, не маглі ведаць, што рэгіструюць будучую палымяную камсамолку, бальшавічку, свайго непрымірымага класавага ворага.

Пасля выгнання нямецкіх акупантаў з тэрыторыі Беларусі Палессе на некаторы час стала савецкім. Тады Вера ўладкавалася працаваць настаўніцай сельскай школы ў вёсцы Пагарэлае Мазырскага павета, адначасова падрабляючы на падзёншчыне ў кулака ў вёсцы Рагалі. Не пакідала тады яе мара пра гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта. Але з-за хваробы ёй не ўдалося ажыццявіць сваю мару. Потым новая акупацыя: на нашу Радзіму напалі легіёны Пілсудскага. Вера пакідае выкладчыцкую работу. Менавіта тады, у тыя суровыя гады грамадзянскай вайны, жыццёвыя дарогі Веры цесна перапляліся з цяжкімі дарогамі нашага слаўнага камсамола. Гораду пагражалі булахоўцы, і Вера разам з юнакамі-камсамольцамі ўступае ў смяротны бой з ворагамі. Разведчыца камуністычнага атрада, яна хадзіла ў штыкавую атаку і ў вызвалены Мазыр уступіла разам з перадавымі часцямі Чырвонай Арміі. Гэта дало ёй маральнае права стаць паўнапраўным членам Камуністычнага Саюза Моладзі. Праз шмат гадоў яна пісала: «Камсамол, камсамол! Не пяць, а пятнаццаць, пяцьдзесят гадоў бяссільны прымусіць мяне забыцца на тое, што камсамол зрабіў мяне бальшавічкай, выхаваў, загартаваў, навучыў не толькі змагацца, але і любіць рэвалюцыйную барацьбу больш за ўсё, больш за жыццё».

Зіма, 1921 год. Вера ў сваім родным Бабруйску. Спачатку працуе інструктарам павяткома камсамола. Энергічная, жыццярадасная, яна хутка становіцца сваёй і сярод бабруйскай моладзі. З зайздроснай нястомнасцю імкнулася ўсюды быць першай.

У ТЫЯ часы перад партыйнымі і савецкімі органамі Бабруйшчыны стаялі складаныя задачы па аднаўленню сельскай гаспадаркі і прамысловасці, ліквідацыі ўзброеных бандытаў, контррэвалюцыйных элементаў, якія імкнуліся звергнуць Савецкую ўладу. Для барацьбы з бандытамі Бабруйскім рэўкомам была створана палітычная камісія пад старшынствам камуніста А. М. Лагвіновіча. За кароткі час гэта камісія пры дапамозе атрадаў чонаўцаў ліквідавала некалькі банд і контррэвалюцыйных груп у горадзе і яго наваколлі, у тым ліку і ў Гарбацэвічах, Вагушаўцы, Мачулках, Пятровічах, Аколіцы. Актыўны ўдзел у ліквідацыі банд прымалі Вера Харужая, Платон Галавач і іншыя.

У снежні 1921 года Бабруйская партыйная арганізацыя прыняла 19-гадовую дзяўчыну ў свае рады, а камсамол рэкамендаваў «самага пісьменнага члена бюро павятовага камітэта» на вучобу ў Мінскую саўпартшколу.

Менавіта ў гэты час Вера далучаецца да актыўнай публіцыстычнай дзейнасці. У яе абудзілася сапраўдная цікавасць да журналістыкі. Ужо ў тыя часы яна друкуе на старонках «Красной смены» (зараз «Чырвоная змена») нарысы, замалёўкі, рэпартажы, агляды друку і іншыя матэрыялы. Беларускія пісьменнікі Андрэй Александровіч і Міхась Чарот звярнулі ўвагу на маладую журналістку, якая пісала ярка, страсна, з агеньчыкам. Вера стала сваім чалавекам у літаратурным асяроддзі. Неўзабаве яе прызначаюць на пасаду рэдактара газеты «Юный пахарь», а таксама выбіраюць членам рэдкалегіі часопіса «Полымя». Вера аказалася надзвычай умелым рэдактарам, дзякуючы чаму газета «Юный пахарь» ператварылася ў папулярны орган сялянскай моладзі.

Здавалася, усё было добра. Вера — рэдактар такой папулярнай газеты, член рэдкалегіі «Полымя», але яе неспакойны характар клікаў у гушчу рэвалюцыйных падзей. Нястрымная сіла цягнула яе ў віхуру барацьбы ў Заходняй Беларусі. У час, калі яна пачала сваю рэвалюцыйную дзейнасць у падполлі, ёй было ўсяго 20 гадоў. Але, нягледзячы на сваю маладосць, дзяўчына валодала лепшымі якасцямі камуніста-падпольшчыка.

Р. БУЛАЦКІ,
доктар гістарычных навук,
прафесар.

ЧАСТА даводзіцца чуць, што студэнты сталі недысцыплінаванымі, прапускаюць лекцыі, няўважліва слухаюць выкладчыкаў. Але...

Гэтыя здымкі зроблены нашым фотакарэспандэнтам С. ПЛЫТКЕВІЧАМ на адной з навукова-практычных канферэнцый. Яны сведчаць аб тым, як самі выкладчыкі, дацэнты, прафесары рэагуюць на выступленні сваіх калег.



# СІЛА. ЗДАРОЎЕ. ПРЫГАЖОСЦЬ.



## ЧУМА ХХ СТАГОДДЗЯ

# СНІД наступае

СНІД — «сіндром набытага імуннага дэфіцыту» упершыню быў апісаны ў 1981 годзе амерыканскімі ўрачамі. Яшчэ ў канцы 70-х гадоў у ЗША звярнулі ўвагу на паяўленне сярод мужчын-гомасексуалістаў групавых выпадкаў саркомы Капошы і пнеўманій. Імуналагічнае і лабараторнае абследаванне выявіла ў гэтых хворых значнае зніжэнне Т-лімфацытаў-хелпераў.

У 1983 годзе французскі вірусолаг Л. Мантанье ідэнтыфіцыраваў вірус, які выклікае СНІД. Яго назвалі «ВІЧ-1» — «вірус імунадэфіцыту чалавека-1». Цяпер вядома, што гэты вірус, які належыць сямейству рэтравірусаў, валодае высокай мутагеннай актыўнасцю. Таму не дзіўна, што ў друку паявіліся паведамленні аб адкрыцці яшчэ некалькіх вірусаў, выяўленых у хворых — ВІЧ-2 і ВІЧ-3.

ВІЧ-1 даволі няўстойлівы ў знешнім асяроддзі — у вадзе, паветры, на посудзе, на бялізне і адзенні. Ён хутка гіне пры тэмпературы вышэй за 60°С і пад уплывам дэзінфіцыруючых сродкаў. У крыві і іншых анкалагічных вадкасцях арганізма чалавека ВІЧ-1 захоўваецца доўгі час.

Як трапляе вірус у арганізм чалавека? Гэта адбываецца пры палавым кантакце з хворым, пры пераліванні крыві ці яе прэпаратаў, перасадцы органаў, якія заражаны ВІЧ-1, ці пры паўторным выкарыстанні забруджанага інфіцыраванай крывёй інструмента. Вірус можа перадавацца ад маці дзіцяці яшчэ ўнутрывантробна.

У Афрыцы суадносіны мужчын і жанчын сярод захварэўшых СНІД роўныя 1,2:1, а ў Заходняй Еўропе — 3:1,2:1. Цяпер даказана, што жанчыны таксама могуць заражацца СНІД, асабліва пры наяўнасці ў іх вялікай колькасці палавых партнёраў, хаця ў жанчын часцей гутарка ідзе аб вірусаносьбіцтве.

У распаўсюджанні СНІД у Афрыцы вялікую ролю адыграла ўрбанізацыя і прастытуцыя. У асобных краінах да 80 працэнтаў прастытутак заражана СНІД.

З моманту рэгістрацыі захворвання ў 1981 годзе колькасць захварэўшых бурна павялічвалася, падвойваючыся кожныя 8—10 месяцаў. На 1 мая 1987 года па зводцы Сусветнай Арганізацыі Аховы Здароўя выяўлена 46.628 выпадкаў СНІД у 101 краіне, у тым ліку ў Еўропе — 4.903.

Па прагнозах спецыялістаў чакаецца, што да канца 1991 года агульная лічба хворых СНІД з клінікай хваробы, якая ў стадыі развіцця, дасягне ў свеце 1 мільёна чалавек, а колькасць інфіцыраваных вірусам СНІД будзе каля 5—10 мільёнаў.

Інкубацыйны перыяд пры СНІД дакладна не ўстаноўлены. Назіранні паказваюць, што ў 50 працэнтаў асоб, інфіцыраваных вірусам, ужо праз 2—4 тыдні выяўляецца «манануклеападобны стан», які характарызуецца ліхаманкай (тэмпература павышаецца да 38—39,5°С) на працягу 2—10 дзён, ангінай, павелічэннем лімфавузлоў, печані, селязёнкі. Да канца 1 месяца пасля заражэння ў крыві можна назіраць антыцелы да віруса ВІЧ-1, выдзеленыя метадам імунаферментнага аналізу.

Гэты пярвічны маніфестны стан змяняецца скрытым перыядам, які можа працягвацца 5—6 гадоў. Пры дакладным клінічным абследаванні ў многіх з гэтых пацыентаў можна выявіць толькі павелічэнне лімфавузлоў.

Клінічная карціна СНІД з'яўляецца вынікам недастатковай імуннай сістэмы арганізма і можа развівацца як цяжкая інфекцыя ці як новаўтваральны (пухлінны) працэс. Часцей за ўсё развіваецца пнеўманія ці атыпічны туберкулёз. У 30 працэнтаў хворых паражаецца цэнтральная нервовая сістэма. Пры гэтым слабее памяць, парушаецца каардынацыя рухаў, зніжаецца інтэлект, развіваюцца паралічы і прыдуркаватасць.

На аснове толькі клінічных даных дыягназ СНІД паставіць цяжка, яго трэба пацвердзіць лабараторнымі данымі.

Зараз у Мінску наладжана лабараторнае абследаванне на СНІД усіх жадаючых на базе Мінскага гарадскога скурна-венералагічнага дыспансера (кабінет № 26), Беларускага навукова-даследчага інстытута мікрабіялогіі і эпідэміялогіі.

Абавязкова абследуюцца на СНІД усе донары. Гэтыя даследаванні дапамогуць выявіць не толькі хворых, але і вірусаносьбітаў (асоб, якія ўжо інфіцыраваны ВІЧ-1, але не маюць клінічных прыкмет хваробы).

У тых выпадках, калі ў крыві абследуемых вылучаны антыцелы да ВІЧ, за хворымі і вірусаносьбітамі вядзецца медыцынскае назіранне.

Як пазбегнуць СНІД?

Вакцына для масавай прафілактыкі СНІД пакуль не створана. Таму найбольш надзейным шляхам прафілактыкі СНІД з'яўляецца максімальна дакладнае аператыўнае інфармаванне насельніцтва пра гэта вельмі небяспечнае захворванне. СНІД — яркі прадстаўнік захворванняў, якія перадаюцца палавым шляхам. Таму ўтрыманне ад выпадковых дашлюбных і пазашлюбных палавых сувязей, барацьба з прастытуцыяй, наркаманіяй і гомасексуалізмам і з'яўляюцца асноўнымі момантамі ўласнай прафілактыкі СНІД.

Пандэмія СНІД — цяжкае выпрабаванне для чалавецтва, падобнае на сярэдневяковую чуму. Толькі аб'яднаныя намаганні ўсіх грамадзян, вучоных і работнікаў аховы здароўя могуць спыніць і перамагчы гэту небяспечную хваробу.

Л. ПАНКРАТАВА,
загадчыца аддзялення пералівання крыві 2-й гарадской клінічнай бальніцы.

---

Клуб «Палітыкус» арганізуе гутарку «СНІД — трагедыя чалавецтва», на якой выступяць выкладчык медінстытута І. Л. Віліčанскі і студэнты-замежнікі. Жадаючых чакаюць 2 лістапада ў 20.00 у кафэ «Гаудэамус».

---

**Ад рэдакцыі.**

Калі матэрыял рыхтаваўся да друку, па універсітэту папаўзлі чуткі. Каб ўнесці яснасць, наш карэспандэнт звярнуўся да прарэктара па міжнародных сувязях Аляксандра Віктаравіча ШАРАПЫ: Ён сказаў:

— Амаль усе замежныя студэнты, якія вучацца ў БДУ, прайшлі праверку на СНІД у паліклініцы. Лабараторныя аналізы выявілі сярод 936 замежнікаў чатырох хворых: адзін студэнт з падрыхтоўчага факультэта, 2 — з факультэта журналістыкі, 1 — з гістарычнага факультэта. Усе захварэўшыя адпраўлены дадому.

Трэба сказаць яшчэ вось аб чым. Аб узнікшых напружаных адносінах паміж савецкімі і замежнымі студэнтамі. Замежнікі скардзяцца, што да іх сталі адносіцца падазрона, нават таксісты адмаўляюцца ў аказанні паслуг. Звяртаемся да свядомасці савецкіх грамадзян і да пачуцця меры! І яшчэ раз паўтараем: вашы таварышы па вучобе прайшлі праверку, хворых адправілі дадому, значыць астатнія — здаровыя.

Для жадаючых прайсці праверку на СНІД у паліклініцы № 33 арганізаваны прыём — кабінет № 710 працуе ў дзве змены: з 9.00 да 12.00 і з 15.00 да 17.00.

## ТОЛЬКІ ДЛЯ ДЗЯЎЧАТ

— У нядзелю паехалі на Камароўку. Кааператыўшчыкаў — поўна, купім што-небудзь модненькае.
— Абы што там усё. Не паеду.

# Што апрануць у «школу»?

АБЫДЗЕМСЯ без лірычных уступаў наконт прыгажосцей восені і якія сантыменты адчуваем мы з гэтай нагоды. Нярэдка восень з'яўляецца прычынай і невясёлых думак, сапсаванага настрою. Раптам скончылася лета (і куды столькі грошай ляснула?), на носе — зіма, а насіць — няма чаго, ну, зусім — так нярэдка скардзяцца сяброўкі адна адной. Звычайна нашы сябры-хлопцы, бацькі ці браты, карацей, мужчыны, рэдка спачуваюць нам па-сапраўднаму. Наадварот: шафа не зачыняецца, нічога немагчыма раскапаць у гэтых наслаеннях адзення, а ёй усё мала!

Не будзем і ханжамі, сцвярджаючы, што не адзёжа галоўнае ў чалавека — гэта ж і так зразумела. Давайце лепш пагаворым, што носяць гэтай восенню ў нашым універсітэце.



На днях выпаў першы сняжок. Не вельмі прыемны для таго, хто не мае яшчэ цёплага паліто на зіму. А калі няма і дэмісезоннага... Самы момант, каб паспрабаваць забіць двух зайцаў. Пашыйце сабе паліто на ваціне ці з падшэўкай, якая адшпільваецца, і каўняром, які можа здымацца. Праўда, у гэтым ёсць адзін недахоп — куды ўвесь час хаваць каўнер, што здымаецца? Яго можна злёгку прышыць, канешне, непрыкметна для чужога вока, што «злёгку», інакш...

Дзе можна пашыць паліто? Тэлефануйце ў даведку быту — 0-67. Майце на ўвазе, што некаторыя атэлье шыюць па «хуткаму» — за дзесяць дзён.

Паліто вышэйшыя за калена губляюць яшчэ нядаўнюю свежасць навінкі. У моладзі зараз папулярныя разнастайныя курткі. Урэшце, нашы дзяўчаты адважыліся апрануць курткі, паўпаліто і нават паліто з паркалю, праштабнаваныя і непраштабнаваныя, але абавязкова на ваціне. Паркаль — усялякі, у буйныя кветкі і зусім дробныя, тут як вам больш падабаецца.

Набыць паліто — яшчэ не значыць сустрэць перадзім'е з усмешкай на вуснах. Не забывайце і на дадатковыя элементы. Папулярны ў гэтым годзе галаўны ўбор. Капялюшы — гэта больш да твару жанчынам пасля дваццаці пяці. Для дзяўчат — усемагчымыя шалі, хусткі, шалікі (не на шыі, а на галаве), хусцінкі — маленькія і вялікія, стракатыя і аднатонныя. Тут таксама неабмежаванае поле для вашай фантазіі — пастарайцеся так завязаць хустку, як ніхто (можаце нават параіцца са сваёй маці — напэўна, яна памятае той час, калі хусткі таксама былі ў фаворы). Хустка можа быць і як дапаўненне да ансамбля, і як самастойны акцэнт. Але не трэба захапляцца і чапляць на галаву ўсё, што падобна на шалік. Напрыклад, непрыгожа выглядаюць жанчыны, якія шалікі, прызначаныя толькі пад каўнер, накручваюць на галаву ці павязваюць, замацоўваючы вузлом.

Зусім па-новаму выглядае зараз і берэт. Гэта ўжо не той — з махеру ці іншых цёплых нітак. Берэт ідзе і юнакам, і дзяўчатам. Яго можна ўпрыгожваць і брошкай.

Наогул, у жаночай модзе ўсё мацнее цяга да жаноцкасці. Ногі ўрэшце вызваляюцца ад засілля штаноў. Значную ролю ў ансамблі адыгрываюць панчохі. Яны розныя: ажурныя, з малюнкам, каляровым малюнкам. Перавага аддаецца чорным панчохам. Але тут важна не захапіцца без меры і густу. Напрыклад, неэстэтычна выглядаюць тоўстыя ногі ў панчохах з кідкім малюнкам або ажурныя панчохі ў ансамблі спартыўнага стылю.

У магазіне не купіш і простых панчох, а дзе ўзяць модныя? Да месца ўспомніць Камароўку. Ці не таму зніклі з продажу звычайныя панчохі, што іх так многа, але ўжо трохі мадэрнізаваных, паявілася на базары? Цікавасць могуць выклікаць шарсцяныя панчохі хатняга гатунку.

Трэба памятаць, што ногі, якія прыцягваюць да сабе ўвагу, павінны быць калі не бездакорнымі, то хаця б больш-менш прыгожымі. І калі вы ўжо нацягнулі на іх прыгожыя панчохі, калі ласка, прасачыце, каб не было на іх дзірак і маршчынак. Французы гавораць: «Лепш дзве маршчынкі на твары, чым адна — на панчохах».

А ці ёсць у вас маленькая чорная спадніца? Неабавязкова, каб была яна маленькай літаральна — па даўжыні. Дарэчы, яе даўжыня можа быць рознай. Але не трэба прыводзіць у шок прахожых разрэзам у ёй. У самім разрэзе можа нічога страшэннага і няма. Нярэдка ён толькі трохі вышэй каленяў. Справа ў тым, што разрэз вельмі прыцягвае да сябе вока нечаканасцю паяўлення.

Пра ўкарочаную спадніцу. Трэба сказаць, што на занятткі яе саромеюцца апранаць. Часцей можна заўважыць дзяўчат у такой спадніцы дзесьці ў кафэ, на танцах, нават на канцэрце. Магчыма, у наступным годзе яна стане больш дэмакратычнай, а пакуль укарочаная спадніца — прывілея юных.

А ці паклапаціліся вы пра пальчаткі? Зразумела, скураныя — гэта дорага, асабліва калі вы жадаеце набыць пальчаткі імпартныя. А можа стыль вашага адзення дазваляе вам насіць не толькі скураныя? Звяжыце іх самі. Тут таксама можна праявіць сваю фантазію і ўменне. Пальчаткі без пальцаў, яшчэ іх называюць «прэтэнцыёзнымі» ці «пальчаткамі кандуктараў 30-х гадоў». Многія цікавяцца: а што гэта за пальчаткі, якія не грэюць? Папершае, грэюць, па-другое, яны вельмі зручныя. А на днях я бачыла такія: пальчыкі рознакаляровыя, а зверху прышыты нібы капюшончык — хочаш здымі, хочаш апрані. Пальчаткі таксама можна ўпрыгожваць якімі-небудзь каменьчыкамі, маленькімі брошкамі.

Дарэчы, пра брошкі і іншыя «цацкі». Некаторыя лічаць, што лепшага ўпрыгожання, чым з золата ці, на дрэнны канец, серабра, быць не можа і не павінна. Можа, яно і так — для тых, хто гэтак думае. Але навошта маладой дзяўчыне такія каштоўныя рэчы? У апошні час біжутэрыя прама-такі перажывае сваё адраджэнне. З'явіліся вырабы з пластыку, дрэва, металу, пластмасы і іншых матэрыялаў, нават не адразу зразумееш, з чаго выраблена тая ці іншая рэч. Модныя брошкі, пацеркі, ланцужкі, завушніцы. Сярод завушніц набываюць папулярнасць завушніцы-кольцы. На той жа Камароўцы ўсё гэта можна ўбачыць у шырокім асартыменце. Аднак перш чым купляць, прыгледзьцеся лепш. Ці не акажацца прывабнае і бліскучае на фоне чорнага аксаміту ўпрыгожанне просценькім і нецікавым у іншым асяроддзі?

Ні ў якім выпадку не купляйце там у чарнавокай «прыгажуні» касметыку, калі яна нават будзе і ў «фірмовай» упакоўцы. Усё гэта — самаробная дрэнь, не гаворачы ўжо пра маральны бок уступлення ў здзелку са спекулянткай. А што датычыць касметыкі, то чым яе менш на вашым твары — тым лепш. І гэтыя словы належаць не маралісту-рэзанёру, а вядучым часопісам сучаснай моды.

Вядома, нашы рэкамендацыі і разважанні нельга лічыць нацэленымі канкрэтна на Ірыну, Свету ці Галю. Мы спадзяёмся і на ваш асабісты густ. Але хочацца думаць, што выпускі «Толькі для дзяўчат» спадабаюцца нашым чытачкам.

Алена ВІХРОВА.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
29 кастрычніка 1987 г.
Зак. 1592.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
З. А. АЛЯШКЕВІЧ.


НАПАМІНАЕМ: ПРАМАЯ ЛІНІЯ «ЧЫТАЧ — ГАЗЕЦЕ. ГАЗЕТА — ЧЫТАЧУ» АДБУДЗЕЦЦА Ў СУБОТУ, 31 КАСТРЫЧНІКА З 10.00 ДА 17.00.